# ФИЛОЛОГИЧЕСКИЙ ФАКУЛЬТЕТ

## ЭКЗІСТЭНЦЫЯ ЧАЛАВЕКА Ў КАНТЭКСЦЕ ХРАНАТОПУ Ў ПАЭТЫЧНЫХ ТЭКСТАХ МАЛАДЫХ БЕЛАРУСКІХ АЎТАРАЎ

**А. В. Анцімонік**

*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Мінск;*
*chornaesonca@gmail.com;*
*навук. кір. – Л. Д. Сінькова, д-р філал. нав., праф.*

У артыкуле разглядаецца канцэпт экзістэнцыі (існавання) чалавека ў адзінстве прасторава-часавага вымярэння на прыкладзе мастацкіх тэкстаў сучаснага маладога пакалення беларускіх паэтаў. У тэкстуальным свеце ў межах хранатопу суб’ект лірыкі з аўтарскай дапамогай атрымлівае мажлівасць спасцігнуць і рэалізаваць самога сябе, перажыць унікальны вопыт быцця і мыслення, што карэлюе са становішчам асобы ў пазамастацкай рэчаіснасці і так ці інакш з’яўляецца актуальным для кожнага індывідуума. Робіцца выснова аб тым, што ў паэзіі В. Морт, В. Гапеевай, Ц. Велета, Ю. Цімафеевай і А. Рудака чалавечая экзістэнцыя арганічна выяўляе сябе ў кантэксце выразна маркіраванага хранатопу, дамінуючую ролю ў якім бярэ на сябе вымярэнне горад – сучаснасць.

**Ключавыя словы:** экзістэнцыя; хранатоп; лірычны герой; сучасная беларуская паэзія.

Канцэпт чалавечай экзістэнцыі як спосабу быцця ўнікальнай асобы заканамерна займае адно з цэнтральных месцаў у парадыгме культуры і, у прыватнасці, у прыгожым пісьменстве. Хранатоп як адзінства/цэласнасць прасторы і часу (тэрмін, як вядома, шырока ўвёў ва ўжытак у сферы літаратуразнаўства М. Бахцін) у сваю чаргу рэгулюе і арганізоўвае быццё чалавека – нават у тэкстуальным свеце. Менавіта ў межах прасторава-часавай злучанасці лірычны герой мае магчымасць самаспасціжэння і самарэалізацыі, перажывання непаўторнага вопыту свайго існавання. Паняцці экзістэнцыі і хранатопу маюць анталагічны характар і часта ўзаемаабумоўліваюць адно адное, пры гэтым першае апрыёрна разгортваецца на фоне другога.

У артыкуле разгледзім рэалізацыю чалавечай экзістэнцыі ў кантэксце хранатопу (найперш праз пару *горад – сучаснасць*) на прыкладах паэтычных тэкстаў В. Морт, В. Гапеевай, Ц. Велета, Ю. Цімафеевай і А. Рудака. Паэзія маладых аўтараў вызначаецца дамінаваннем гарадскіх

матываў над вясковымі і скіраванасцю лірычных герояў на цяперашні час.

Яскравы пейзаж сучаснага горада – з архітэктурай, прыроднымі элементамі, колерамі, рэчамі і рэчывамі – дае В. Морт у «Одзе да Бранкі»: «Вось жыццё ў горадзе, чые рэбры-калоны / Загорнутыя ў халат эпідэміі снегу. // <…> / Мора няма, / але могілкі разбіваюць свае гранітныя хвалі / аб жоўтыя палоскі вулічнага святла – / <…> // Прыпынак транспарту свеціцца ў цемры, / <…> / Аўтобусы жуюць асфальт» [1, с. 18]. Кардынальна іншым бачыцца горад герою верша «ніхто ад пачатку не павінен разумець…» Ц. Велета: дрэнны настрой суб'екта лірыкі спрыяе параўнанню горада з маразматычным дзядком, хворым на страўнік [2, с. 41]. Лірычны герой А. Рудака часам таксама характарызуе навакольную прастору праз свае дыскамфортныя адчуванні: «у горадзе шумна і тлумна, няўтульна і пыльна» [3, с. 4]. Гераіня В. Гапеевай балансуе паміж касцёлам, сінагогай, мячэццю і царквой [4, с. 10] альбо губляе ўласную індывідуальнасць і адчувае сябе пабочным прыдаткам мужчыны: «ён любіць шпацыраваць са мной па горадзе / <…> ён захапляецца маёй кампактнасцю і з радасцю / дэманструе сябрам / а я адчуваю што са мной нешта не так / бягу ў прыбіральню і ў люстэрку бачу замест сябе / парасон // забыты ў незнаёмай кавярні / чужога горада» [4, с. 15].

У вершы «супраць мяне ўздымаецца ўсё напачатку…» Ц. Велета ідэнтычнасць лірычнага героя яўна фарміравалася ў вясковых умовах (хранатапічная пара *вёска – мінулае*), прадвызначаючы станаўленне асобы: «там за кожным капцом схавацца хацеў, / бегаў шпарка, цішком, пераскокваў цераз плот / і бег да ракі і да млына, / углядаўся ў ваду, бачыў там адно сябе і нябёсы: / поруч птушка, што падаць умее, / поруч дрэва, што сохне паволі, / вось і я – прыдурэлы і ціхі хлапчук, / што шукае спаміж хатаў-дамоў састарэлых / апошнія дзверы» [2, с. 3]. Лірычная ж гераіня верша «Цырк» Ю. Цімафеевай тлумачыць сваю натуру праз вобраз вандроўнага цырка, з якім яна нарадзілася («З цыркам, толькі падумай, / у палескай вёсцы» [5, с. 6]).

Геаграфія вершаў не асабліва багатая, затое відавочна, што згаданыя паэтамі назвы эмацыянальна блізкія ім і іх лірычным героям (перавага, зноў жа, аддаецца гарадам). У тэкставай прасторы фігуруе Варшава, якую спадарожнікі праязджаюць у вершы В. Морт «Берлін – Мінск» [1, с. 61]. Вену, Будапешт і Гомель [6, с. 27] мімаходзь згадвае гераіня В. Гапеевай, а вось на Венецыі і сваіх роздумах у яе кантэксце затрымліваецца на цэлы верш «– як не паехаць у венецыю –». Парыж робіцца вызначальным для гераіні Ю. Цімафеевай (верш «Блышыны рынак»), дадзены горад становіцца адбіткам экзістэнцыі лірычнага

персанажа ў вершы «У Парыжы столькі вуліц, мая Марта…». На першае месца тут выводзіцца заглыбленасць у свой унутраны свет і нават пэўная эгацэнтрычнасць [5, с. 26].

Самае істотнае месца атрымлівае ў тэкстах Мінск XXI стагоддзя (сталае месца пражывання большасці маладых творцаў, а для некага – родны горад ад нараджэння), які ўгадваецца па характэрных элементах у асобных паэтычных творах нават без згадкі наймення (вершы В. Морт «Малалеткі», «Мінская Песня», В. Гапеевай «– верш пра слана –», Ю. Цімафеевай «Сэрца-Камароўка», «грубасць гэтага горада…», «МОЛОДЕЧНОБЕЛЬ», Ц. Велета «я зненавідзеў гэты горад…» і інш). Што да канкрэтных улюбёных паэтамі куткоў сталіцы, то асаблівае месца надаецца дзвюм гістарычна і культурна важным лакацыям – Нямізе і Камароўцы. У вершы «Мінская Песня» В. Морт насамрэч апяваецца знакамітая рака, якая «цячэ / праз вушка іглы» і «праз ныркі сабак», у тэксце злучаецца мінулае і сучаснае (хаця ў рэшце рэшт «Няміга цячэ – / час стаіць»), падкрэсліваецца асаблівасць гэтага месца і для сябе, і для горада. Змрочны вобраз нямігаўскіх ваколіц выяўляецца ў Ц. Велета: яго лірычны герой, перажываючы боль існавання, шпацыруе «ўздоўж мёртвай вены Свіслачы» [2, с. 8]. Драматызм дадзенага месца падкрэслівае і суб’ект верша «Чароўная песня Нямігі» А. Рудака: «Няміга спявае і плача, няўцешна і глуха» [3, с. 4].

Пра адметнасць сённяшняй Камароўкі ёміста і проста заяўляе суб’ект лірыкі Ю. Цімафеевай: «ты сэрца гэтага горада / свежае мокрае сіне-чырвонае / <…> / ты ўся ў вечным руху / <…> / ты ўся жаданне / і ўся трымценне» [5, с. 38]. Адметна, што тэкст пачынаецца з голасу лірычнага «Я», гераіня адразу абазначае сваю датычнасць да згаданай у назве лакацыі, але пераводзіць увагу з магчымай унутранай рэфлексіі на характарыстыку месца праз існаванне ў ім самых прыкметных яе персанажаў («велічных малочніц», «каралеваў мясных астравоў» і «сырных уладарак»). Блізкая гэта лакацыя і для лірычнага героя А. Рудака, таму што «Дзесьці на мяжы Камароўкі з Пярэспай, / дзе блукаюць хмары між бетонных вяршалінаў, / непрыкметна скончылася нашае маленства, / сказала доўга жыць і адляцела проста ў вырай» [3, с. 18].

Часта ў тэкстах фігуруюць транспартныя сродкі (дадатковы доказ таго, што героі тэкстаў існуюць у сучасным горадзе): «я начую там, дзе тралейбусы / спяваюць свае ядзерныя маўчанкі» [7, с. 13], «бывае проста на прыпынку / стаіце чакаючы дзынькальнага тралейбуса» [6, с. 19]. У тралейбусе ж са сваім спадарожнікам ад гарадской грубасці ратуецца «на апошніх сядзеннях / з апошніх сіл учапіўшыся / пальцамі ў пальцы» [5, с. 48] гераіня паэтычнага твора «грубасць гэтага горада…»

Ю. Цімафеевай. Часам ад такога населенага пункта даводзіцца хавацца, каб адчуць сваю свабоду, і адмысловае месца для такой мэты знаходзіць лірычнае «Мы» аднаго з самых вядомых вершаў В. Морт: «Толькі ў грамадскіх туалетах мы адчувалі свабоду, / дзе за дзвесце рублёў ніхто не пытаў, што мы там / робім» («Беларуская мова») [1, с. 42]. Яшчэ адзін варыянт – «стаць нікім, / а проста целам якое абдымаюць / на адзінаццатай платформе / горада на L» [6, с. 10], верагодна, такім чынам раствараючыся ва ўрбаністычным пейзажы і зліваючыся з ім, перамагаючы боль свайго існавання.

Як бачым, лірычныя героі і гераіні часта ўпісаны ў той хранатоп, дзе на першы план выходзіць горад і цяперашні час. Суб'екты паэтычнага свету існуюць у межах канкрэтных топасаў, самым улюбёным з якіх з'яўляецца Мінск (асаблівая роля ў тэкстах адводзіцца Нямізе і Камароўцы). Урбаністычны пейзаж становіцца альбо фонам для выражэння перажыванняў і эмацыянальнага стану, альбо адбіткам акалічнасцей унутранага свету. З горадам звязана шмат успамінаў, перажыванняў і асацыяцый лірычнага «Я», нячасты канцэпт вёскі выступае пераважна як прасторава-часавае вымярэнне дзяцінства і пачатку сталення асобы. Сучасны горад можа паўставаць як натуральнай прасторай для быцця, як сцэнай для шырокага спектру эмоцый, так і месцам, ад якога хочацца выратавацца ці схавацца. Чалавечая экзістэнцыя ў паэтычных тэкстах маладых аўтараў арганічна выяўляе сябе ў кантэксце выразна маркіраванага хранатопу.

**Бібліяграфічныя спасылкі**

1. *Морт В*. Эпідэмія ружаў. Мінск : Логвінаў, 2017.
2. *Велет Ц*. Злом : вершы. Мінск : Галіяфы, 2019.
3. *Рудак А*. Верхні горад : вершы. Мінск : Кнігазбор, 2014.
4. *Гапеева В*. Чорныя макі : вершы. Мінск : Галіяфы, 2019.
5. *Цімафеева Ю*. Цырк: вершы. Мінск : Выдавец Зміцер Колас, 2016.
6. Гапеева В. Граматыка снегу. Мінск : Галіяфы, 2017.Морт В. Я тоненькая як твае вейкі: тэксты. Мінск : Логвінаў, 2005.